# «Над зямлёю шугае верасень»

**Восень раскрывае прыгажосць прыроды ў яе заваданні…**

# Мэты ўрока:

**1**. *Працягваць навучанне вызначаць тэму, ідэю, асноўную думку вершаваных твораў, выпрацоўваць уменне знаходзіць у вершы мастацкія сродкі вобразнасці (эпітэты, метафары, параўнанні і г.д.)*

**2**. *Развіваць уменне выразна чытаць вершы, розныя па змесце і настроі.*

**3**. *Ствараць умовы для выхавання пачуцця прыгажосці мастацкага слова.*


Лета – час шчаслівых.
Восень - час паэтаў.

# М. Багдановіч

*Вечар на захадзе у попеле тушыць*
*Кучу чырвоных кавалкаў вугля;*
*Ціха ўсё: вецер лістка не зварушыць,*
*Не скалыхнуцца ні траўкай паля;*
*Цёмныя цені даўжэй у лагчыне,*
*Птушкі прыстаўшай марудней палёт;*
*Сумна плыве маладзік бледна-сіні*
*Ў небе вячэрнім, зялёным, як лёд;*
*Іскрацца зорак сняжынкі маркотна,*
*Збожжа пакрылася шызай расой...*
*Кіньма жа думкі аб долі гаротнай,*
*Хоць бы на момант спачынем душой!*

# Аналіз верша:

1. Тэма
2. Асноўная думка
3. Мастацкія сродкі вобразнасці:

- *Эпітэты (___________________________)*
- *Метафары (__________________________)*
- *Параўнанні (_________________________)*

# Аналіз верша:

1.Тэма *(Восень)*

2. Асноўная думка *(Кіньма жа думкі аб долі гаротнай, хоць бы на момант спачынем душой)*

3. Мастацкія сродкі вобразнасці:

- ***Эпітэты*** *(чырвоных кавалкаў вугля; цёмныя цені; птушкі прыстаўшай; маладзік бледна-сіні; у небе вячэрнім, зялёным…; шызай расой; долі гаротнай)*
- ***Метафары*** *(вечар у попеле тушыць; плыве маладзік)*
- ***Параўнанні*** *(ў попеле, кучу чырвоных кавалкаў вугля; небе зялёным, як лёд; зорак сняжынкі)*

# В. Зуёнак

*Над зямлёю*

*шугае верасень —*

*Восені ветразь...*

*І плывуць у блакіце чыстым*

*Ключы галасістыя...*

*Цеплыня адплывае,*

*крылом узмахнуўшы аслаблым -*

*Летам бабіным...*

*Не трымайце ж мяне сягоння,*

*Сцены хат,*

*у лагодным палоне:*

*Над зямлёю шугае верасень —*

*Восені ветразь!..*

*Не шукайце, сябры і родныя,*

*Не гукайце на сцежках пройдзеных...*

*Не сустрэнемся — слёз не ліце.*

*«Ён жа быў летуценнік, — скажыце, —*



# **Шугаць -**

1. Гарэць яркім полымем з успышкамі агня;
2. Выпраменьваць яркае святло, палымнець;
3. Хутка, з вялікай сілай узлятаць угору (пра дым, іскры);

11. Развявацца, лунаць, рэяць, трапятацца;
12. Добра расці, хутка развівацца, буяць; *перан*. Праяўляцца, праходзіць бурна.

# Вызначце:

**1. Тэма**

**2. Асноўная думка**

1. *Восень*

2. *У верасні немагчыма не заўважаць прыгажосць наваколля.*

# Знайдзіце параўнанні-перыфразы

- *У блакіце чыстым – у небе*
- *Ключы галасістыя -* ____________________
- ____________________*- летам бабіным*
- ____________________ *- верасень*

# Адказ:

- *У блакіце чыстым – у небе*
- *Ключы галасістыя - <u>жураўлі</u>*
- *<u>Крылом аслаблым</u> - летам бабіным*
- *<u>Восені ветразь</u> - верасень*

# Выберыце сродкі, ўжытыя аўтарам для перадачы ўзвышана-ўрачыстага і разам з тым крыху жартаўлівага настрою верша:

*а) параўнанне характару чалавека са з'явай прыроды;*

*б) зварот да людзей, які ўтрымлівае адмаўленне, а не сцвярджэнне;*

*в) самахарактарыстыка (самапрэзентацыя) лірычнага героя.*

# Алесь Наўроцкі “Чатырохгранная ваза”



***Лета, зматвай свае вудачкі!***
***Дрэвы выплаўляюць руду.***
***Вецер свістаў спачатку ў дудачку,***
***потым у дудку, а ўжо затым у дуду.***

***Адзвінелі промняў сонечныя прыіскі,***
***адзвінеў дажджоў серабрысты апад,***
***адзвінелі лісты і ляжаць залацістым прыскам*, -***
***што прайшло, не вернеш назад.***

- Паразважайце над характарам лірычнага героя, паспрабуйце вызначыць яго настрой і адносіны да жыцця.

# Дамашняе заданне

- *1. Выразнае чытанне верша В. Зуёнка “Над зямлёю шугае верасень…”*
- *2. Падрыхтаваць вуснае паведамленне на тэму “Восень у маім горадзе”*

